Падтрымай "Вясну" на PATREON

Яшчэ двух жыхароў Жлобіна асудзілі да "хатняй хіміі" за падзеі 9-10 жніўня

30.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Суд Жлобінскага раёна

29 ліпеня суд Жлобінскага раёна разглядзеў крымінальную справу ў дачыненні да Іллі Груздзёва і Сяргея Якубенка, якіх вінавацілі ў актыўным удзеле ў групавых дзеннях, што груба парушаюць грамадскі парадак у ноч з 9 на 10 жніўня ў Жлобіне (ч. 1 арт. 342 КК).

Справу разглядаў суддзя **Яўген Ерафееў**. Бок дзяржабвінавачвання падтрымлівала **Ціпашкіна**.

Паводле абвінавачвання, Ілля Груздзёў, Сяргей Якубенка сумесна з іншымі неўстаноўленнымі асобамі вечарам 9 жніўня прыйшлі ў цэнтральную частку горада Жлобіна, дзейнічалі сумесна і ўзгодненна, з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных поглядаў і пратэста супраць хода і вынікаў выбараў, а

таксама вядзення дэструктыўнай дзейнасці, накіраванай на абвастрэння напружанасці ў грамадстве, прынялі актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, груба парушаючых грамадскі парадак і спалучаных з яўным непадпарадкаваннем патрабаванням прадстаўнікоў улады. Пры гэтым, абвінавачаныя сумесна з іншымі актыўнымі ўдзельнікамі мітынгу наўмысна перашкаджалі руху транспарта і працы прадпрыемстваў: выйшлі і знаходзіліся на праезднай частцы дарогі вул. Першамайскай, стаялі у счэпцы, гучна крычалі і пляскалі ў далоні, выкрыквалі лозунгі, свісцелі, дэманстратыўна і адкрыта адмаўляліся выконваць патрабаванні супрацоўнікаў міліцыі. У выніку такіх дзеянняў некалькі аўтобусаў былі вымушаныя змяніць маршрут свайго руху, таксама вымушана спыніў працу магазін “Мір прадуктаў”.

Абвінавачаныя прызналі віну поўнасцю. Пры гэтым Ілля Груздзёў і Сяргей Якубенка паміж сабой знаёмыя не былі, камяні не кідалі, у счэпцы не стаялі.


Якубенка прыйшоў у цэнтр горада ў кафэ, каб выпіць піва. Праз некаторы час пабачыў, як людзі пачалі збірацца на вуліцы, з’явіліся і міліцыянты. Натоўп выйшаў на праезную частку, пачалі выкрыкваць лозунгі, у тым ліку “Жыве Беларусь” і “Милиция с народом”, людзі камунікавалі паміж сабой. Пад “уздзеяннем натоўпу” Сяргей Якубенка таксама выйшаў на праезную частку. Паводле відэазапіса, які быў паказаны абвінавачанаму, Якубенка выкрыкнуў у бок міліцыянтаў выраз: *“Вы супраць народу ідзеце”*. Кажа, што чуў, як міліцыя загадвала людзям разыйсціся. Прызнае віну ў тым, што быў у стане алкагольнага ап’янення, перашкаджаў руху транспарта і працы магазіна. Шчыра раскайваецца.


У судзе выступілі сведкі, некаторыя сведкі ў суд не з’явіліся, пасля былі вывучаныя пісьмовыя матэрыялы справы.

У выніку суд пакараў абвінавачаных абмежаваннем волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу: Сяргея Якубенку тэрмінам на 3 гады, а Іллю Груздзева – на 2 гады і 6 месяцаў.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

